# БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКІЯ ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ ВА ЎМОВАХ РАЗВІЦЦЯ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА Ў 2014–2020 гг.

**У. А. Касцоў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, uladzislau.kascou@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя накірункі беларуска-кітайскіх эканамічных адносін ва ўмовах фарміравання стратэгічнага партнёрства паміж краінамі ў перыяд з 2014 па 2020 г. Вызначаюцца вектары дзейнасці і напрамкі супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы, уплыў знешніх і ўнутранных чыннікаў на фарміраванне і развіццё беларуска-кітайскага стратэгічнага партнёрства.

***Ключавыя словы:*** Беларуска-кітайскія адносіны; стратэгічнае партнёрства; эканоміка; гандаль; вектары развіцця.

# БЕЛОРУССКО-КИТАЙСКИЕ ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ОТНОШЕНИЯ В УСЛОВИЯХ РАЗВИТИЯ СТРАТЕГИЧЕСКОГО ПАРНЁРСТВА В 2014–2020 гг.

**В. А. Косцов**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, uladzislau.kascou@mail.ru*

В статье рассматриваются основные направления белорусско-китайских экономических отношений в условиях формирования стратегического партнёрства между странами в период с 2014 по 2020 г. Определяются векторы деятельности и направления сотрудничества в экономической сфере, влияние внешних и внутренних обстоятельств на формирование и развитие белорусско-китайского стратегического партнёрства.

***Ключевые слова:*** Белорусско-китайские отношения; стратегическое партнёрство; экономика; торговля; векторы развития.

# BELARUSIAN-CHINESE ECONOMIC RELATIONS IN THE CONTEXT OF STRATEGIC PARTNERSHIP DEVELOPMENT IN 2014–2020

**U. Kastsou**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, uladzislau.kascou@mail.ru*

The article examines the main directions of Belarusian-Chinese economic relations in the context of the formation of a strategic partnership between the countries in the period from 2014 to 2020. It identifies the vectors of activity and areas of cooperation in the economic sphere, as well as the influence of external and internal circumstances on the formation and development of the Belarusian-Chinese strategic partnership.

***Keywords:*** Belarusian-Chinese relations; strategic partnership; economy; trade; development vectors.

Беларуска-кітайскае эканамічнае супрацоўніцтва прайшло некалькі этапаў развіцця. На сённяшні дзень мы назіраем, што ўзаемадзеянне паміж Рэспублікай Беларусь і Кітаем набірае абароты. У артыкуле разглядаецца перыяд, калі партнёрства атрымала статус стратэгічнага. Дадзены перыяд характарызаваўся шматкратным павелічэннем аб'ёмаў і пашырэннем двухбаковага ўзаемадзеяння. Таму дасягнуты поспех варты далейшай распрацоўкі і даследавання для захавання актуальных тэндэнцый.

Пачатак новага этапу беларуска-кітайскага эканамічнага ўзаемадзеяння быў спалучаны з пачаткам геапалітычнага крызісу, які пэўным чынам паўплываў на лагістычныя шляхі ва Усходняй Еўропе. З гэтага часу значэнне транспартнага калідора праз Беларусь значна ўзрасло. Дадзеныя падзеі спрыялі паступовай дапрацоўцы дагаворна-прававой базы супрацоўніцтва, шчыльнаму ўзаемадзеянню ў навукаёмістых сферах, такіх як інфарматызацыя, машынабудаўніцтва і гэтак далей, развіццю мясцовай лагістыкі. Калі абмяркоўваць агульныя лічбы за пачатак перыяду, то неабходна адзначыць, што працягваюць захоўвацца тэндэнцыі росту аб'ёмаў беларускага экспарту.

Важным крокам для паглыблення супрацоўніцтва становіцца наданне Беларусі статусу краіны-назіральніцы пры Шанхайскай Арганізацыі Супрацоўніцтва (ШАС) ў 2015 г. У маі адбылася знакавая сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі з новым Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам. Па выніках гэтых працэсаў, вялікія інвестыцыі атрымаў беларуска-кітайскі індустрыяльны парк «Great Stone», сума праекта дасягнула адзнакі ў 30 млрд дал. ЗША інвестыцый [1, с. 1]. Апроч таго, падчас сустрэчы было заключана 20 мемарандумаў і разнастайных пагадненняў на суму 3,5 млрд дал. ЗША. З беларускага боку гігантамі сталі «Беларуская калійная кампанія», якая дамовілася аб пастаўках у Кітай сваёй прадукцыі, а таксама «МТЗ» і «Гомсельмаш» дамовіліся з кітайскай «Цзуньшэнь» аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў [3, с. 168].

Неабходна выдзяліць асаблівасці беларускага экспарту ў КНР. Для яго характэрны працяг працэсу дыверсіфікацыі, пачатак якому быў пакладзены на мінулым этапе развіцця беларуска-кітайскіх адносін. Адносна новай рысай стаў працэс рэструктурызацыі беларускага экспарту, а таксама ўскладненне структуры партнёрства. Акрамя таго, з'яўляюцца такое паняцце як інтэнсіфікацыя двухбаковага гандлю. Рэструктурызацыя несла сабой стымуляванне з'яўлення новых галін прамысловасці, якія б у перспектыве маглі пачаць экспартаваць свае тавары ў Кітай. Такім чынам прадпрыемствы лёгкай і харчовай прамысловасці Беларусі паступова пры актыўнай падтрымцы з боку ўраду пачалі трапляць на кітайскія рынкі і займаць свае нішы.

Новы імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву надаў візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў КНР ў верасні 2016 г. На сустрэчы было зацверджана выкананне мінулых дамоўленасцяў, а таксама былі заключаны 30 новых мемарандумаў і дагавораў па ўзаемадзеянні краін у самых разнастайных сферах. Галоўным стаў мемарандум аб узаемапаразуменні паміж Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь і Дзяржбанкам КНР, а таксама стварэнне беларуска-кітайскага інвестыцыйнага фонду [3, с. 179]. Працягваючы тэму ШАС, варта адзначыць, што ў тым жа 2016 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь упершыню прымае ўдзел у паседжанні арганізацыі ў якасці лідара краіны-назіральніцы [5, с. 1]. Працягваліся і працэсы дыверсіфікацыі і рэструктурызацыі, доля калійных угнаенняў паступова зніжалася. Станам на 2017 г. структура беларуска-кітайскага гандлю выглядала прыкладна такім чынам: з Беларусі экспартавалася каля 238 таварных пазіцый. У той час калі імпартавалася 977 таварных пазіцый, у тым ліку апатарура сувязі, вылічальная тэхніка, разнастайнае абсталяванне, металаканструкцыі і іншае [3, с. 177].

Цягам перыяду актыўны рост назіраецца ў сферы інвестыцый. Адбываецца паступовы пераход у беларуска-кітайскім супрацоўніцтве ад звязаных інвестыцый і крэдытаў да прамога інвеставання. Такім чынам, за 2018 г. Рэспубліка Беларусь атрымала інвестыцый на суму 339,9 млн дал. ЗША, з якіх 55,2 % адносіліся да прамых [3, с. 198]. Працягвалася рэалізацыя транзітнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь на гандлёвым шляху «Кітай–Еўропа». Аб'ём кантэйнерных перавозак дасягнуў адзнакі ў 332 тысячы кантэйнераў, што складала 89 % ад наземных паставак КНР ў краіны Еўрасаюза [3, с. 211]. Цэлы шэраг беларускіх кампаній лясной і лесаапрацоўчай прамысловасці пачалі сваё засваенне ўнутраных рынкаў Кітая ў рамках праграмы «Беларусь — краіна лясоў» [3, с. 166]. Агульны тавараабарот паміж краінамі працягваў свой устойлівы і якасны рост. Па выніках працы ў 2018 г. ён склаў каля 4,39 млрд дал. ЗША [6, с. 1].

Для беларуска-кітайскіх эканамічных адносін 2019 г. адназчыўся якасным працягам працэсу дыверсіфікацыі беларускага экспарту і ўскладнення структуры двухбаковага тавараабароту. Беларускае кіраўніцтва актыўна субсідавала нацыянальныя кампаніі для іх больш лёгкага пераходу на ўнутраныя рынкі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Вынікам стала пастаўка лесаматэрыялу на суму 23,8 млн дал. ЗША [3, с. 167]. У рамках выканання праграмы Эканамічнага пояса Шаўковага шляху Беларусь і Кітай актыўна ўзаемадзейнічалі ў тым ліку ў сферы лагістыцы, а таксама ў фінансавай сферы. Беларусь атрымлівала пашыранае фінансаванне з боку кітайскіх кампаній і банкаў. У эканоміку было прыцягнута 141,2 млн дал. ЗША прамых інвестыцый [4, с. 68]. Аб'ёмы беларуска-кітайскага гандлю таксама працягвалі свой рост.

На сённяшні момант верхняй мяжой дадзенага этапу беларуска-кітайскага эканамічнага ўзаемадзеяння можна лічыць 2020 г. Гэта звязана ў першую чаргу з пандэміяй COVID-19, якая паглыбіла сусветную эканоміку ў стагнацыю і пэўным чынам аказала ўплыў на далейшае супрацоўніцтва. Варта адзначыць, што шматлікія абмежаванні і крызісныя абставіны ў сур'ёзнай ступені не пашкодзілі двухбаковаму супрацоўніцтву. Для Беларусі і Кітая 2020 г. стаў паказальным, бо абраныя стратэгіі ў выніку прывялі да новых і якасных паказчыкаў. Агульны тавараабарот паміж краінамі дасягнуў свайго гістарычнага максімума на суму 5,43 млрд дал. ЗША. Працэс дыверсіфікацыі значна паўплываў на структуру беларускага экспарту, і таму на момант 2020 г. доля калійных угнаенняў складала толькі 42,8 % ад агульнага аб'ёму [2, с. 273]. Свайго гістарычнага максімума дасягнулі і пастаўкі прадукцыі харчовай, малочнай і лёгкай прамысловасці. Аб'ём кантэйнерных перавозак праз Беларусь дасягнуў 540 тысяч кантэйнераў.

Такім чынам, беларуска-кітайскае эканамічнае ўзаемадзеянне напрыканцы дадзенага этапу дасягнула вельмі значных вынікаў як у двухбаковым гандлі, так і ў сферы прыцягнення інвестыцый у нацыянальную эканоміку Беларусі. Паспяхова праведзена праграма дыверсіфікацыі і рэструктурызацыі гандлю. Рэспубліка Беларусь атрымала статус аднаго з важнейшых лагістычна-транспартных вузлоў для Кітайскай Народнай Рэспублікі. Краіны зблізіліся ў тым ліку і ў рамках удзелу ў такіх арганізацыях як Шанхайская Арганізацыя Супрацоўніцтва, а таксама праз распрацоўку сумесных праектаў, такіх як «Great Stone». Быў закладзены трывалы падмурак пад беларуска-кітайскай дагаворна-прававой базай і дыпламатыяй, што стварыла спрыяльныя ўмовы для ўдасканалення і далейшага пашырэння супрацоўніцтва і павелічэння яго аб'ёмаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Індустрыяльны парк «Great Stone». URL: https://industrialpark.by/?ysclid=m8pyr2mq66598144124 (дата звароту: 12.09.2025).

2. Гісторыя развіцця сяброўскіх адносін Беларусі і Кітая / А. А. Каваленя і інш. Мінск: Выдавецкі дом «Беларуская навука», Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Акадэмія грамадскіх навук Кітайскай Народнай Рэспублікі правінцыі Ганьсу. 2022. С. 463.

3. *Мацэль В. М.* Беларусь–Кітай: 30 год на шляху сяброўства ўзаемнавыгаднага супрацоўніцтва: [манаграфія]. Мінск: Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. 2021. С. 383.

4. *Мядзведзева І. В.*, *Кангра І. С.* Беларусь у лічбах: Статыстычны зборнік. Мінск: Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь. 2016. С. 72.

5. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: Удзел Беларусі ў ШАС. URL: https://president.gov.by/ru/belarus/economics/integracija/shos (дата звароту: 11.09.2025).

6. Пасольства Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы: гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва 2017–2021 гг. URL: https://china.mfa.gov.by/ru/bilateral/trade (дата звароту: 11.09.2025).